9. Купала і Колас, вы нас гадавалі: дак. і мат.: У 2 кн. — Кн. 1. 1909—1939. / уклад.: В. Дз. Селяменеў, В. У. Скалабан. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2010.
10. Купала і Колас, вы нас гадавалі: дак. і мат.: У 2 кн. — Кн. 2. 1909—1939. — Ч. 1 / уклад.: В. Дз. Селяменеў, В. У. Скалабан. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011.
11. Лихачев, Д. С. Текстология: краткий очерк. 2-е изд. — М.: Наука, 2006.
12. Макаренко, Е. А. Интеграция научно-справочного аппарата бывшего Центрального партийного архива (ЦПА) КПБ в информационно-поисковую систему Национального архива Республики Беларусь // БАШ. — Вып. 18. — Мінск: БелНДДАС, 2017.
13. НАРБ. — Ф. 1440. — Оп. 1. — Д. 317.
14. НКВД в Западной Беларуси: сентябрь—декабрь 1939 г.: док. и мат. — Минск; М.: Фонд «Историческая память», 2019.
15. Оперативные сводки Белорусского штаба партизанского движения: январь—июль 1944 г.: док. и мат. — Минск: НАРБ, 2019.
16. Покровский, Н. Н. «Текстология» Д. С. Лихачева и проблемы издания документов XX века // Проблемы сохранения и изучения культурного наследия: К 100-летию академика Д. С. Лихачева. Материалы научной сессии Отделения историко-филологических наук РАН. Москва., 20 декабря 2006 г. / отв. ред. А. П. Деревянко. — М.: УОП Института этнологии и антропологии РАН, 2006.
17. Собрание законов и распоряжений Рабоче-Крестьянского правительства Белорусской Социалистической Советской Республики. — 8 сентября 1933. — № 33.
18. Тэксталогія і яе дапаможныя навукі: вучэб.-метад. дапам. / В. П. Рагойша [і інш]; пад рэд. В. П. Рагойшы. — Мінск: БДУ, 2015.
19. Фонды бывших архивов Коммунистической партии Белоруссии: Кратк. справ.: В 2 ч. — Ч. 1 / Сост.: Г. С. Данилова, В. Д. Селеменев; предисл. В. Д. Селеменева, М. Ф. Шумейко. — Минск: НАРБ, 1997.
20. Хорошкевич, А. Л. Археографическая комиссия императорской Академии наук и ее традиции издания Литовской метрики // Metriciana: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. Т. ІІІ. — Мінск: Athenaeum, 2004.
21. Шумейко, М. Ф. Археографическая подготовка и публикация документов КПБ/КПСС: методические рекомендации. — Минск: БелНИИДАД, 2017.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 27.01.2020*



**В. С. Іванова,**
*дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук;*
e-mail: ivanova.volga.s@gmail.com

## АРХІЎНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў ПОЛЬШЧЫ

*Навучанне архівіста патрабуе набыцця шырокіх ведаў не толькі ў галіне гісторыі і яе дапаможных дысцыплін, але таксама геаграфіі, лінгвістыкі, гісторыі арганізацый, права і шматлікіх іншых, якія будуць складаць этас прафесіі.*

*Дарыюш Магер [1, s. 218]*

Развіццё архівазнаўства як навуковай дысцыпліны ў апошнія дзесяцігоддзі, а таксама агульныя грамадскія працэсы інфарматызацыі, глабалізацыі і антрапалагізацыі істотна ўздзейнічаюць і на асноўныя прафесійныя кампетэнцыі архівіста і вызначаюць узровень запатрабаванасці грамадствам спецыялістаў такога кшталту. Упершыню гэтая праблема пачала падымацца амерыканскімі архівазнаўцамі яшчэ ў 70-я гг. XX ст. [2], а ў апошнія дзесяцігоддзі над ёй актыўна працуюць польскія архівазнаўцы, чый досвед можа быць актуальным для адказу на актуальныя выклікі беларускай грамадскай прасторы.

Фарміраванне традыцыі архіўнага навучання ў Польшчы суправаджалася і навуковымі дыскусіямі ў галіне архіўнай дыдактыкі. Ужо ў міжваенны перыяд пачалі актыўна распрацоўвацца прынцыпы архіўнай тэорыі і методыкі ў Варшаўскім архівазнаўчым асяродку, які, як ужо адзначалася, уключаў у сябе выкладчыкаў універсітэта і супрацоўнікаў вядучых архіваў. У 1920-я гг. на старонках часопіса «Archeion» і іншых перыядычных выданняў пачалі выказвацца думкі аб неабходнасці стварэння архіўнай школы для магчымасці назапашвання і трансляцыі эмпірычнага досведу і тэарэтычных падыходаў. У прыватнасці, Казімірам Канарскім была агучана ідэя стварэння вышэйшай акадэмічнай школы ў галіне архівазнаўства і бібліятэказнаўства [3].

Аднак першая грунтоўная навуковыя праца па праблеме адукацыі архівістаў у Польшчы з'явілася ўжо ў пасляваенны перыяд. Гэта быў артыкул Мар'яна Фрыдберга на старонках штогодніка «Archeion» у 1966 г. Тут архіўнае навучанне ў Польшчы разглядалася ў кантэксце агульнаеўрапейскай традыцыі. Адзначалася, што ад якасці падрыхтоўкі архівіста наўпрост залежыць эфектыўнасць працы архіваў. Звернута ўвага не толькі на архівазнаўчы, але і на дыдактычны бок пытання [4]. Разважанні над аналагічнымі пытаннямі былі працягнуты і ў артыкуле Анджэя Томчака 1978 г. Аўтар звяртаў увагу на тое, што эфектыўнае функцыянаванне архіўнай службы наўпрост залежыць ад узроўню прафесіяналізму архіўных кадраў, нарматыўных асноў працаўладкавання, атракцыйнасці прафесіі архівіста, годнай аплаты працы, узроўню

ўніверсітэцкай адукацыі, належнай яе арганізацыі і інш. Адзначаліся станоўчыя і праблемныя бакі гэтай сістэмы ў Польшчы [5].

Істотныя арганізацыйныя змены 1990-х гг. запатрабавалі і сур'ёзнага тэарэтычнага асэнсавання падыходаў да навучання архівістаў. У 2003 г. у 105 выпуску «Archeion»'а была апублікавана шырокая дыскусія пра адукацыю архівістаў [6]. Адзін з аўтараў гэтага нумара штогодніка, Ірэна Мамчак-Гадкоўска адзначала, што ў Польшчы ўжо некалькі гадоў працягваецца дыскусія аб змяненні мадэлі адукацыі архівістаў. На той момант амаль усе польскія ўніверсітэты рыхтавалі архівістаў на гістарычных факультэтах. Крыніцай дыскусіі сталі пытанні аб інфарматызацыі і мадэрнізацыі вышэйшай адукацыі ў цэлым. Ішла гаворка аб тэндэнцыях да выхаду архіўнай спецыяльнасці па-за межы гістарычных факультэтаў, яе адасаблення ці аб'яднання з напрамкамі навуковай інфармацыі і бібліятэказнаўства. Інакш архівазнаўства рызыкуе застацца толькі адукацыяй для вузкага кола кадраў гістарычных архіваў [7; 8].

Арганізатары І Торуньскіх архіўных канфрантацый у 2007 г. надалі ім назву «Архівістыка ва ўніверсітэтах і архівістыка ў архівах». Дыскусія была прысвечана таму разрыву, які існуе паміж асяродкамі тэарэтыкаў і практыкаў, якія працуюць у агульным напрамку захавання архіўнай спадчыны. Канферэнцыя падзялялася на дзве часткі: «Новыя ідэі ў архівістыцы» і «Праблемы архіўнай адукацыі». У дыдактычным блоку выступоўцы найбольш канцэнтраваліся на праблематыцы ўніверсітэцкага навучання на дзвюх ступенях, пасля ўвядзення балонскай сістэмы [9, s. 9—15].

У гэтым жа годзе была створана Секцыя архіўнай адукацыі пры Таварыстве польскіх архівістаў, задачай якой стаў абмен досведам паміж рознымі адукацыйнымі асяродкамі, распрацоўка праграм, падручнікаў, слоўніка архівістаў і г. д. [10]. Яна пачала працу над вельмі важным дакументам, які фіксаваў і іерархізаваў кампетэнцыі архівістаў, а таксама і надаваў напрамак для развіцця архіўнай адукацыі. Гэта т. зв. «Мадэль прафесійных кампетэнцый архівістаў і дакументазнаўцаў», якая была зацверджана 4 лістапада 2010 г.

У яе распрацоўцы прымалі ўдзел прадстаўнікі вядучых польскіх асяродкаў архіўнай адукацыі. Былі вылучаны тры ўзроўні кампетэнцый: фундаментальны (1-я ступень адукацыі), спецыяльны (2-я ступень) і навуковы (падрыхтоўка дактарантаў). На першым узроўні вылучаны дзесяць раздзелаў кампетэнцый: гісторыі і гісторыі архіваў, права і кіравання, кіравання дакументамі ва ўстанове, камплектавання і экспертызы каштоўнасці, захоўвання і кансервацыі архіўных дакументаў, апрацоўкі дакументаў, інфармацыйнай дзейнасці і доступу да дакументаў, супрацоўніцтва з іншымі інстытутамі памяці, а таксама раздзел агульных прафесійных правіл і прынцыпаў. На другім узроўні гэта тры раздзелы: агульных кампетэнцый, дакументацыі да XX ст., папулярызацыі, адукацыі і архіўнай інфармацыі. Згодна гэтай мадэлі ў далейшым распрацоўваліся праграмы навучання, пачынаючы з 2012 г. Гэтае пытанне абмяркоўвалася на VI Усеагульным з'ездзе польскіх архівістаў у



Вроцлаве. Мэтай архіўнай дыдактыкі тут дэкларавалася неабходнасць укаранення найноўшых навуковых архівазнаўчых дасягненняў у архіўную адукацыю. Пры гэтым форму і змест навучання кожная ўстанова абірала самастойна [11].

Што тычыцца распрацоўкі новага зместу архіўнай адукацыі, то ў дыскусіях польскіх архівазнаўцаў вылучаюцца некалькі асноўных накірункаў. Першы з іх — гэта неабходнасць укаранення ў навучанне найноўшых дасягненняў лічбавай архівістыкі. Праблема лічбавых архіваў палягае не толькі ў тэхналагічнай плоскасці, але і ў тэарэтычным, прававым, грамадскім і эканамічным полі. Паўстае шэраг пытанняў: *Ці патрабуе новы носьбіт рэвізіі фундаментальных тэарэтычных архівазнаўчых паняццяў, як, напрыклад, паняцце «фонд», ці яно мусіць заставацца нязменным? Ці патрэбна выпрацоўка новых паняццяў? Як новы носьбіт уздзейнічае на межы архіўнага фонду і яго структуру? Якім чынам будзе адбывацца экспертыза каштоўнасці? Ці змяняюцца ў сувязі з гэтым грамадскія функцыі архівістаў?*

У 2013—2014 гг. па ініцыятыве Варшаўскага архівазнаўчага асяродка і прафесара Аліцыі Кулецкай адбыліся дзве сустрэчы архівістаў і архівазнаўцаў па тэмах «Лічбавая архівістыка ў архіўнай адукацыі» і «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны ў навучанні архівістаў», па выніках якіх пабачыў свет зборнік артыкулаў «Лічбавае архівазнаўства і дапаможныя гістарычныя дысцыпліны. Праблемы дыдактыкі архівазнаўства». Ён стаў першай спробай пошуку адказаў на гэтыя пытанні [12]. Так, Галіна Рабутка і Дарота Джэвецка з упэўненасцю заявілі, што асновай эфектыўнай працы ў сістэмах электроннага дакументазвароту і электронных архіваў з'яўляецца найперш добрае валоданне метадамі архіўнай і дакументацыйнай працы ў сістэмах традыцыйных, бо жыццёвы цыкл дакументаў не змяняецца пры рознасці віду носьбіта. Таму навучанне архівістаў у накірунку лічбавых архіваў павінна ажыццяўляцца толькі пасля засваення імі базавых прынцыпаў архівазнаўства [13, s. 30—33].

Другі накірунак, найбольш грунтоўна закрануты ў даследаваннях і непасрэдна звязаны з першым, — гэта ўвядзенне электронных тэхналогій у непасрэднае навучанне архівістаў. У 2012 г. Нацыянальны лічбавы архіў Польшчы (NAC) перадаў для навучання архівістаў у Гістарычны інстытут Варшаўскага ўніверсітэта інфармацыйную сістэму ZoSIA (Zintegrowany operacyjny System Informacji Archiwalnej) для працы па ўсіх накірунках архіўнага захоўвання ад камплектавання да выкарыстання. Асноўным вынікам дыдактычнай працы з сістэмай стала ўдасканаленне навыкаў студэнтаў па працы і складанні архіўных даведнікаў і архіўным апісанні. На гэтай аснове быў створаны лічбавы дыдактычны архіў, які прыдаўся і для практычных заняткаў наступных пакаленняў архівістаў [14, s. 50—55].

У архіўным навучанні актыўна выкарыстоўваюцца афіцыйныя інтэрнэт-старонкі Галоўнай дырэкцыі архіваў і дзяржаўных архіваў, дзе можна знайсці асноўныя перыядычныя выданні галіны, базы даных і іншыя архіў-

ныя даведнікі. Карыснымі для розных накірункаў архіўнага навучання з'яўляюцца таксама: Архіўны інтэрнэт-форум (IFAR, http://www.ifar.pl), анлайн курсы для архівістаў грамадскіх архіваў (http://kursy.archiwa.org), ютуб-канал Нацыянальнага лічбавага архіва (NAC, https://www.youtube.com/user/archiwumcyfrowe), электронная праграма навучання лацінскай палеаграфіі, распрацаваная ва ўніверсітэце Адама Міцкевіча ў Познані «In Nomine Domini» (http://paleografia.home.amu.edu.pl) [15]. Тэхналогіі актыўна ўжываюцца і для асэнсавання ролі і місіі архівіста, дакумента, архіваў у сучасным свеце. Як прыклад можна прывесці фільм студэнткі Універсітэта Мікалая Каперніка ў Торуні Агнешкі Стэмпоўскай «Дакумент у жыцці чалавека» [16].

Агулам, выкладчыкі адзначаюць вялікую цікавасць студэнтаў пры навучанні праз зразумелае для іх тэхнічнае і віртуальнае асяроддзе. Ганна Собчак звяртае ўвагу на неабходнасць выкарыстання ў навучанні архівазнаўству новых педагагічных падыходаў [17]. Сярод іх прапаноўваюцца наступныя: навучанне праз дзеянне (англ. «learning by doing»), навучанне праз выкарыстанне (англ. «learning by using»), навучанне праз узаемадзеянне (англ. «learning by interacting»). Тут увага скіроўваецца найперш на вучня, тэхналогіі, аддаленае навучанне і элементы праектавання архіўных працэсаў. Актуальнымі з'яўляюцца таксама самастойны пошук інфармацыі, самаадукацыя, індывідуалізацыя навучання. Абапіраючыся на распрацоўкі амерыканскага даследчыка ў галіне адукацыі Марка Прэнскі (Marc Prensky), аўтар зважае на розніцу адукацыйных падыходаў для т. зв. «лічбавых тубыльцаў» (англ. «digital natives») і «лічбавых мігрантаў» (англ. «digital immigrants»). Для першых тэхналогіі сталі часткай жыцця пачынаючы ад нараджэння. Але сістэма адукацыі ўсё яшчэ трансфармуецца з часоў далічбавай эпохі, гэта доўгі і складаны працэс. Таму чаканні маладога пакалення, якое хацела б працаваць у зразумелай ім лічбавай прасторы, часта не спраўджваюцца. Навучанне для «лічбавых тубыльцаў» усё больш нагадвае гульню. І найлепш яго праводзіць у натуральным асяродку, дзе вырашэнне адукацыйных задач адбываецца праз пошук і эксперымент.

Актуальныя кампетэнцыі архівістаў, на думку польскіх архівазнаўцаў, палягаюць таксама і ў веданні прававых аспектаў працы з архіўнымі дакументамі (напрыклад, аховы інтэлектуальнай уласнасці [18]), педагагічных метадык для іх выкарыстання ў навучанні школьнікаў і студэнтаў (архіўная педагогіка) [19], валоданні тэорыяй сацыяльнай камунікацыі для набыцця камунікацыйных навыкаў [20] і інш.

Карыстаючыся досведам французскіх і іспанскіх калег, у Польшчы ў навучанне архівістаў быў уведзены такі прадмет, як «Сацыяльная камунікацыя». Ён з'яўляецца актуальным у кантэксце магчымасці атрымання сучаснымі архівістамі навыкаў камунікацыі з карыстальнікамі, сродкамі масавай інфармацыі і інш. Што, у сваю чаргу, несумненна паспрыяе і набыццю новага погляду на ролю архіваў у грамадстве.



Адукацыйная дзейнасць у польскіх архівах прысутнічала шмат дзесяцігоддзяў, аднак на сённяшні дзень вядзецца гаворка аб іх адаптацыі да сучасных дыдактычных патрабаванняў. Прафесійныя кампетэнцыі архіўнага педагога былі акрэслены ва ўжо згаданай Мадэлі прафесійных кампетэнцый архівіста і дакументазнаўцы (2010 г.). У той яго частцы, якая тычыцца ўзроўню спецыяліста ў галіне прасоўвання, адукацыі і архіўнай інфармацыі. Выпускнік другой ступені навучання ў галіне архівазнаўства і кіравання дакументамі павінен мець магчымасць папулярызаваць архіўныя рэсурсы, выкарыстоўваць іх у адукацыйных мэтах і мэтах развіцця рэгіянальных супольнасцей. Сукупнасць кампетэнцый, якія змяшчаюцца ў мадэлі, вызначаюць профіль архіўнага педагога і веды архівіста з навыкамі педагога і культурнага аніматара. З мадэлі вынікае, што выпускнік павінен валодаць асноўнымі методыкамі псіхалогіі і педагогікі, каб мець магчымасць распазнаваць і рэагаваць на розныя адукацыйныя патрэбы сацыяльна арыентаванага грамадства, адаптавацца да розных людзей і груп, выкарыстоўваць формы і метады, адпаведныя іх патрэбам, пры гэтым ведаючы асаблівасці адукацыйнай сістэмы сваёй краіны [21].

Для інтэграцыі і камунікацыі архівістаў, якія займаюцца ў сферы архіўнай педагогікі, у 2014 г., па прыкладу нямецкіх архівістаў (вэб-партал Archivpädagogen), а таксама польскіх музейных работнікаў (Форум музейных педагогаў), была створана адпаведная платформа для абмену вопытам і ведамі [22].

У 2016—2017 навучальным годзе ў рамках паслядыпломнага навучання ў галіне архівазнаўства і кіравання дакументамі ва ўніверсітэце імя Мікалая Каперніка былі створаны новыя спецыяльнасці. Адна з іх — адукацыя і папулярызацыя архіваў — ахоплівае чатыры прадметы. Два ў галіне папулярызацыі (сацыяльная камунікацыя ў архівах, сувязь з грамадскасцю ў архівах) і два ў сферы адукацыі (архіўная педагогіка, формы адукацыйнай дзейнасці архіваў).

Такім чынам, падыходы да навучання архівістаў у Польшчы, якія маюць даволі глыбокія карані і развіваюцца ў кантэксце традыцыйнай еўрапейскай мадэлі навучання гісторыкаў-архівістаў, за апошнія дзесяцігоддзі набылі новыя арганізацыйныя формы і змест. Гэта звязана і з істотным павелічэннем асяродкаў архіўнага навучання, балонскім працэсам і ўвядзеннем дзвюх ступеняў адукацыі, зменамі навучальных праграм, але асабліва — з істотнымі гуманітарнымі і тэхналагічнымі зменамі. Яны змянілі і архіўную навуку, і архіўнае навучанне. І, як слушна адзначае Агнешка Роса, «па сутнасці самі архівісты з'яўляюцца сёння ініцыятарамі змен, якія адбываюцца ў архіве, вызначаюць месца і ролю архіваў у гэтых зменах». Найбольш істотныя зместавыя трансфармацыі палягаюць ва ўкараненні ў архіўнае навучанне дасягненняў лічбавай архівістыкі, сучаснай педагогікі, лічбавага навучання, тэорыі камунікацыі і права. Гэтыя напрамкі на сённяшні дзень з'яўляюцца

ўніверсальнымі для ўдасканалення зместу архіўнай адукацыі, у тым ліку і ў Беларусі.

Літаратура

1. Magier, D. Regionalna rola archiwum państwowego w epoce postindustrialnej // I Toruńskie Konfrontacje Archiwalne. — T. 1. Archiwistyka na uniwersytetach archiwistyka w archiwach / pod red. W. Chorążyczewskiego, A. Rosy. — Toruń, 2009. — S. 213—222.
2. Падрабязней гл.: Іванова, В. Выклікі сучаснасці і змена місіі архівіста // Здабыткі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; склад. Т. А. Сапега і інш. — Вып. 22. — 2019. — С. 114—129.
3. Kaczmarczyk, K. Potrzeby naszych archiwów // Nauka Polska. — 1929. — № 10. — S. 522—523; Konarski, K. Kursy archiwalne // Archeion. — 1927. — № 2. — S. 184—193.
4. Friedberg, M. Przygotowanie do zawodu archiwisty // Archeion. — T. 44. — 1966. — S. 7—29.
5. Tomczak, A. Kształcenie archiwistów w Polsce i innych krajach Europejskich // Archeion. — 1978. — T. 66. — S. 29—65; Lewandowska, M. Kadra archiwistów państwowych w Polsce Ludowej (1945—1983). — Warszawa, 1988. — 199 s.
6. Nałęcz, D. Od Redakcji // Archeion. — T. 105. — 2003. — S. 7—9.
7. Mamczak-Gadkowska, I. Aktualne kierunki kształcenia archiwistów i archiwalnych badań naukowych na świecie w świetle badań opublikowanych przez Carola Couture'a // Archeion. — T. 105. — 2003. — S. 14—22.
8. Skupieński, K. Dyskusja nad perspektywami kształcenia archiwistów na polskich uniwersytetach — stadium pytań czy otpowiedzi? // Archeion. — T. 105. — 2003. — S. 23—41.
9. I Toruńskie Konfrontacje Archiwalne. — T. 1. Archiwistyka na uniwersytetach archiwistyka w archiwach / pod red. W. Chorążyczewskiego, A. Rosy. — Toruń, 2009. — 407 s.
10. Sekcja Edukacji Archiwalnej. SAP [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://sap.waw.pl/dzialalnosc_statutowa/sekcja-edukacji-archiwalnej. — Дата доступу: 24.04.2020.
11. Chorążyczewski, W., Kwiatkowska, W. Sylwetka i kompetencje absolwenta studiów archiwistyki i zarządzania dokumentacją // Problemy archiwistyki. — 2009. — № 2. — S. 4—11; Model kompetencji zawodowych archiwisty [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://sap.waw.pl/dzialalnosc_statutowa/model-kompetencji-zawodowych-archiwisty. — Дата доступу: 24.04.2020.
12. Archiwistyka cyfrowa i nauki pomocnicze historii w edukacji archiwalnej. Problemy dydaktyki archiwistyki / Red. A. Kulecka. — Warszawa, 2016. — 157 s.
13. Drzewiecka, D. O potrzebie kształcenia «archiwistów cyfrowych» // Archiwistyka cyfrowa… S. 27—33.
14. Kulecka, A. Cyfrowe Archiwum Dydaktyczne // Archiwistyka cyfrowa… S. 50—57.
15. Biniaś-Szkopek, M. Pierwszy polski internetowy program do nauki paleografii łacińskiej // Archiwistyka cyfrowa… S. 45—49.
16. Film «Document in a Human Life» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=oADXMRj7vT4&list=PLwjCExSC0UWG0rO4C5IhG13nChkC4_Dy5. — Дата доступу: 24.04.2020.
17. Sobczak, A. Nowe trendy w edukacji i możliwość ich zastosowania w nauczaniu archiwistyki // Archiwistyka cyfrowa… S. 19—26.



18. Konstankiewicz, M. Kompetencje w zakresie prawnych aspektów ochrony własności intelektualnej i dóbr osobistych w cyfrowym warsztacie archiwisty // Archiwistyka cyfrowa… S. 34—40.
19. Mazur, H. Edukacja archiwalna w Polsce — realna potrzeba czy prejsciowa moda? // Historia — Pamiac — Tożsamość w edukacji humanistycznej. — T. 4. Archiwum jako «strażnik pamięci». — Kraków, 2016. — S. 19—32.
20. Jabłońska, M. Komunikacja społeczna na studiach archiwistycznych jako krok ku poprawie wizerunku archiwów polskich // I Toruńskie Konfrontacje Archiwalne… S. 241—250.
21. Rosa, A. Działalność edukacyjna archiwów w kształceniu archiwistów na Uniwersytecie Mikołaja Kopernika w Toruniu // Archiwa—Kancelarie—Zbiory — № 7(9). — 2016. — S. 77—90.
22. Mazur, H., Rosa, A. O potrzebie szkolenia archiwistów w zakresie edukacji // Archiwa—Kancelarie—Zbiory. — № 5(7). — 2014. — S. 169—181.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 20.08.2020*